УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3



***Верамеева А. А., Зархіна В. К.***

**УПЛЫЎ ДЭФЕКТАЎ РОТАВАЙ ПОЛАСЦІ НА ЯКАСЦЬ МАЎЛЕННЯ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н.В.***

*Кафедра беларускай і рускай моў*

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Прыгожая дыкцыя і правільнае маўленне з'яўляюцца залогам поспеху ва ўсіх сферах жыцця чалавека. Для таго каб прымусіць аўдыторыю слухаць і прыслухоўвацца да вашых слоў, кожнае слова павінна быць выразным, гучным і зразумелым. Некаторыя дэфекты маўлення, такія як картавасць, гугнявасць і шапялявасць, могуць стаць вялікай праблемай у некаторых прафесіях.

Захворванні поласці рота даволі распаўсюджаны, што робіць актуальнай праблему іх прафілактыкі і лячэння. Да развіцця паталогіі прыводзяць розныя прычыны і фактары, значную частку якіх можна ліквідаваць, а значыць, папярэдзіць захворванне.

Пытанне барацьбы з паталогіямі поласці рота з'яўляецца не толькі адным з найбольш важных і актуальных у медыцыне, але і тычыцца шматлікіх аспектаў сацыяльнага жыцця грамадства, бо анатамічныя дэфекты ротавай поласці змяняюць яе аб'ём, мабільнасць органаў і, такім чынам, уплываюць на разборлівасць маўлення. І хоць вымаўленне не з'яўляецца жыццёва важнай функцыяй ротавай поласці, паталогіі вярбальнай функцыі, якія ўзнікаюць у дарослых, нясуць за сабой эфект «ізаляцыі» па прычыне немагчымасці мець стасункі з навакольным светам звыклым спосабам. А паколькі індывід - істота сацыяльная, адсутнасць магчымасці кантактаваць з іншымі людзьмі прыводзіць да псіхалагічных цяжкасцяў, а пры цяжкіх парушэннях – да дэфектаў псіхікі. Кантынгент асоб, якія апынуліся ў сацыяльнай ізаляцыі, востра мае неабходнасць у асаблівай дапамозе, адной з задач якой лічыцца аднаўленне камунікатыўнай функцыі маўлення. Кажучы аб статыстыцы, колькасць маўленчых расстройстваў у дзяцей і падлеткаў расце, у сувязі з чым актуальнасць гэтай праблемы прымае сусветны характар. І толькі агульная праца артадонтаў, дзіцячых стаматолагаў, лагапедаў і выкладчыкаў у дзіцячых дашкольных установах дае магчымасць выяўляць і карэкціраваць функцыянальныя парушэнні ў самым раннім узросце.

Маўленне – гэта форма паводзін, якая таксама схільна да змянення ў камунікацыі. Гэта гаворыць аб тым, што эмацыйны стан таксама адыгрывае важную ролю ў артыкуляцыйным апараце. Трэба сказаць, што вялікі ўплыў аказваюць і будова ротавай поласці, зубоў, дзяснаў, таму важна выконваць меры прафілактыкі і гігіены.

Акрамя таго існуюць прыроджаныя фактары парушэнняў: напрыклад, у чалавека вырастае менш зубоў ці больш, чым трэба. Гэта прыводзіць да дэфектаў сківіцы: могуць ўтварыцца шчыліны паміж зубоў. Да знешніх прычын можна аднесці, напрыклад, ўздзеянне неспрыяльных фактараў і інш.

"Крывыя" зубы і няправільны прыкус могуць стаць прычынай псіхалагічных праблем зносін, парушэнні гукавымаўлення, невыразнай дыкцыі і неспрыяльна адбіцца на агульным развіцці ў цэлым.

Репозиторий БГМУ